УДК 392.8(=161.3)

# НА НІВЕ АЙЧЫННАЙ ЭТНАЛОГІІ: УКЛАД ПРАФЕСАРА НАВАГРОДСКАГА Т.А. У ВЫВУЧЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ ХАРЧАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ

***Ірына Бачыла***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*
bochilo@bsu.by

У артыкуле аналізуецца ўклад айчыннага этнолага, прафесара Навагродскага Т.А. у вывучэнне традыцый харчавання беларусаў. Аўтарам разгледжаны і сістэматызаваны працы вучонага, ахарактарызавана база выкарыстаных ім крыніц і метадаў, вызначана ступень вывучанасці навукоўцам дадзенай часткі матэрыяльнай культуры беларусаў.

***Ключавыя словы: беларуская этналогія, Навагродскі Т.А., традыцыі харчавання, беларускі этнас***

# NATIONAL ETHNOLOGY: THE CONTRIBUTION OF PROFESSOR NOVOGRODSKY T.A. TO THE STUDY OF THE FOOD TRADITIONS OF BELARUSIANS

***Iryna G. Bachyla***
*Belarusian State University, Minsk, Belarus*

The article is devoted to the analysis of the contribution to the study of the eating traditions of the Belarusians by the ethnologist, professor Novogrodsky T.A. The author attempts to study and systematize scientist's works, describe used sources and scientific methods, determine the level of topic under consideration inquiry.

***Keywords: Belarusian ethnology, Novogrodsky T.A., food traditions, Belarusian ethnos***

У гісторыі айчыннай этналогіі Навагродскі Т.А. і яго навуковыя здабыткі займаюць пачэснае месца. Вучоны з’яўляецца адным з выбітных і аўтарытэтных спецыялістаў, які ўпершыню выкарыстаў новы метадалагічны падыход пры вывучэнні доўгі час мала даследаванай у беларускай этналогіі праблематыкі – традыцый харчавання. Надзейным падмуркам для прапанаваных аўтарам тэарэтычных поглядаў на гэтую частку матэрыяльнай культуры сталі палявыя дадзеныя, якія збіраюцца даследчыкам ва ўсіх гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі ўжо трыццаць гадоў.

Тадэвуш Антонавіч Навагродскі нарадзіўся ў 1965 г. у вёсцы Арцюшы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Навучаўся ў Ваўкавыскім педагагічным вучылішчы, пасля чаго паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1991 г. Навагродскі Т.А. быў залічаны ў аспірантуру Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па спецыяльнасці «Этналогія», дзе падрыхтаваў арыгінальную кандыдацкую дысертацыю аб традыцыях харчавання беларускага этнасу, якая была ім абаронена ў 1995 г. [1, с. 267].

Пасля заканчэння аспірантуры Навагродскі Т.А. працаваў навуковым супрацоўнікам аддзела этналогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі, дацэнтам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2000 г. ім было апублікавана першае спецыяльнае даследаванне «Традыцыйная культура харчавання беларусаў». У ім былі змешчаны вынікі працы па праблеме за перыяд 1990-х гг. з улікам вопыту папярэднікаў. Праз год на гістарычным факультэце БДУ была створана кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. З гэтага часу Навагродскі Т.А. працуе на гэтай кафедры спачатку дацэнтам, а з 2008 г. загадчыкам. Менавіта ў гэты перыяд у поўнай ступені праявіўся яго талент выкладчыка, даследчыка, кіраўніка. З вялікім майстэрствам ён выкладае курс беларускай этналогіі, яе гістарыяграфію, знаёміць студэнтаў з метадамі палявых этнаграфічных даследаванняў.

Тадэвуш Антонавіч першым сярод айчынных спецыялістаў у галіне этналогіі пачаў даследаваць традыцыі харчавання як цэласную множнасць элементаў (сістэму) у сукупнасці адносін і сувязей паміж імі [6]. Яго папярэднікамі (тымі, хто працаваў на этналагічнай ніве да другой паловы 1980-х гг.) традыцыі харчавання вывучаліся пераважна ў сувязі з даследаваннем усяго комплексу матэрыяльнай культуры беларусаў і выключна з выкарыстаннем параўнальна-гістарычнага метаду. Асноўная ўвага пры гэтым надавалася пераважна стравам, у значна меншай ступені закраналіся тэхналогіі прыгатавання, трапезы, напоі, прадметы хатняга начыння. Заставаўся не распрацаваным тэарэтычны аспект праблемы, тэрміналагічны апарат.

Навагродскім Т.А. упершыню былі вылучаны і ахарактарызаваны ключавыя групы фактараў, якія аказваюць уплыў на структуру традыцый харчавання. Гэта фактары вышэйшага ўзроўня (прыродна-

геаграфічны, сацыяльна-эканамічны, гістарычна-культурныя традыцыі, сезоннасць) і фактары ніжэйшага ўзроўня (даступнасць сыравінных кампанетаў, спецыяльныя навыкі і веды, уплыў запазычанняў).

У працах навукоўца паказана, што сярод іншых кампанентаў традыцый харчавання стравы найбольш хутка рэагуюць на змены ў гістарычным і сацыяльна-эканамічным развіцці [7, с. 5], а іх структура залежыць ад сыравіны, якую пастаўляе мясцовая гаспадарка. Ён выявіў бінарныя апазіцыі харчовых прадуктаў на некалькіх узроўнях: «земляробства – жывёлагадоўля», «раслiннае – жывёльнае» і г. д. Структурны аналіз, выкананы даследчыкам, дазволіў яму вызначыць, што большасць беларускіх страў XIX – пачатку XX ст. былі мучнымі, крупянымі, з гародніны [5, с. 13]. Навагродскі Т.А. ахарактарызаваў асноўныя спосабы і прыёмы прыгатавання страў, адзначыў, што галоўная бінарная апазіцыя тэхналогіі прыгатавання адпавядае восі «сырое – гатаванае».

Вучоны адным з першых сярод айчынных навукоўцаў раскрыў змест паняцця трапеза і паставіў пытанне аб неабходнасці больш глыбокага вывучэння гэтай з'явы. Ён вызначыў месца трапезы ў структуры традыцый харчавання, вылучыў дзве групы трапез (паўсядзённыя і святочныя), паказаў, што паўсядзённыя трапезы з'яўляюцца ядром усёй сістэмы харчавання этнасу. Даследчык ахарактарызаваў час і месца правядзення трапез, склад удзельнікаў, паслядоўнасць ужывання пэўных страў, адрозненні паміж імі, раскрыў ключавую бінарную апазіцыю трапез («штодзённыя – святочныя»), вылучыў дзве групы святочных трапез (звязаныя з каляндарным і сямейным цыклам).

Вучоны даследаваў функцыі штодзённых і святочных трапез, чаргаванне посных і скаромных перыядаў, традыцыйныя беларускія трапезы як сродак выхавання, іх выкарыстанне для перадачы ведаў, навыкаў і вопыту старэйшага пакалення дзецям. Навагродскі Т.А. параўнаў функцыі штодзённых і святочных трапез, асобная ўвага была звернута на памінальныя трапезы і разнастайнасць іх функцыяналу (ушанаванне, сакральная, выхаваўчая).

Вынікам працы Навагродскага Т.А. па вывучэнню рэгіянальных асаблівасцей традыцый харчавання беларусаў стаў шэраг публікацый: «Смачна елі... Народная кулінарыя Гомельшчыны» (1994), «Народная кулінарыя Магілёўшчыны (на матэрыяле палявых этнаграфічных даследаванняў)» (1999), «Народная кулінарыя Браслаўшчыны (на матэрыялах палявых этнаграфічных даследванняў)» (2001), «Традыцыі народнага харчавання беларусаў у Заходнім Палессі» (2008), «Традиции питания белорусов Восточного Полесья (по материалам полевых этнографических исследований)» (2010), «Традиции питания белорусов в Западном Полесье» (2020), «Традыцыі харчавання беларусаў Падняпроўя» (2021). Аўтар паказаў блізкасць асноў харчавання беларусаў у розных частках Беларусі, колькасць і час прыёму ежы, правілы паводзін, асаблівую ролю гаспадара ў час трапезы. Ён падрабязна апісаў рэгіянальную спецыфіку асобных страў і напояў, іх прыгатаванне і назвы.

Дзякуючы актыўнай дзейнасці Навагродскага Т.А., адным з цэнтраў вывучэння традыцый харчавання беларусаў на сённяшні дзень з'яўляецца кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ [8, с. 7]. Для студэнтаў, якія скончылі першы курс, кафедрай штогод ладзіцца выязная этнаграфічная практыка. На працягу трох тыдняў яны маюць магчымасць замацаваць веды па этналогіі, у тым ліку аб традыцыях харчавання беларускага этнасу. З моманту ўтварэння кафедры (2001) яе супрацоўнікамі былі арганізаваны экспедыцыі ў розныя часткі Беларусі: 2005 г. – г. п. Мір Гродзенскай вобласці, 2006 г. – в. Гольчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці, 2007 г. – Камянецкі раён (в. Каменюкі, Дзмітравічы і інш.) Брэсцкай вобласці, 2008 г. – г. п. Мір Гродзенскай вобласці, 2009 г. – в. Моталь Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, 2010 г. – в. Тышкаўцы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, 2011 г. – Астравецкі раён (в. Рымдзюны, Гервяты, Гальчуны і інш.) Гродзенскай вобласці, 2012 г. – в. Семежава Копыльскага раёна Мінскай вобласці, 2013 г. – г. Глыбокае Віцебскай вобласці, 2014 г. – Лепельскі раён Віцебскай вобласці, 2015 г. – Браслаўскі раён Віцебскай вобласці, 2016 г. – Барысаўскі раён Мінскай вобласці (в. Мсціж, Загор'е, Гаражанка, Макаўе і інш.), 2017 г. – Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці, 2018 г. – Лідскі раён Гродзенскай вобласці (в. Ваверка, Кавалі, Серафіны і інш.), 2019 г. – Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці (в. Міжэрычы, Шэйкі, Клепачы і інш.). Сабраныя за гэты час матэрыялы часткова надрукаваны: «Народная кухня маталян. Кулінарныя традыцыі Беларускага Палесся» (2009), «Народная кухня тышкаўцоў» (2010), «Кулінарная спадчына Белавежжа» (2010), «Народная кухня Гервятаў» (2011), «Народная кухня Семежава» (2013). Названыя выданні з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для далейшага вывучэння дадзенай часткі матэрыяльнай культуры беларусаў.

Вынікі шматгадовых этналагічных даследаванняў традыцый харчавання беларусаў Навагродскі Т.А. падсумаваў у манаграфіі «Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст.» (2015), якая ў 2016 г. была абаронена ім у якасці доктарскай дысертацыі [9]. У працы аўтарам раскрыты працэс эвалюцыі традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст. на аснове сістэмнага вывучэння гістарычна-этнаграфічнай спадчыны. У яе аснову былі пакладзены матэрыялы, сабраныя даследчыкам на працягу 1992 – 2015 гг. ва ўсіх гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах нашай краіны. За гэты час вучоным у ходзе экспедыцый было апытана 577 чалавек, а ў навуковы ўжытак былі ўведзены арыгінальныя дадзеныя, якія ў значнай ступені ўзбагацілі веды аб народнай кухні беларусаў [4, с. 7].

Навуковыя здабыткі прафесара Навагродскага Т.А. знаходзяць самае шырокае прымяненне ў разнастайных сферах – адукацыйнай (пры выкладанні курсаў у ВНУ краіны); пры падрыхтоўцы і выданні вучэбна-метадычных дапаможнікаў [3, 10]; на курсах павышэння кваліфікацыі для экскурсаводаў, гідаў-перакладчыкаў, выкладчыкаў і дыпламатычных работнікаў. Вынікі шматгадовых даследаванняў навукоўца выкарыстоўваліся ў практычнай дзейнасці пры арганізацыі і правядзенні Міжнароднага фестывалю «Мотальскія прысмакі», пры падвядзенні вынікаў Рэспубліканскага конкурсу «Прадукт года» і Рэспубліканскага конкурсу на лепшую аграсядзібу ў намінацыі «Традыцыйная беларуская кухня»; у паўсядзённай дзейнасці шэрагу кафэ, рэстаранаў беларускай кухні, айчынных аграсядзіб. Прафесар Навагродскі Т.А. рэгулярна выступае ў якасці эксперта па ўключэнню асобных страў у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Так, у мінулым годзе было падрыхтавана адпаведнае экспертнае заключэнне «Традыцыі прыгатавання дранікаў і бульбяных бліноў у Гродзенскай вобласці».

Досыць плённа прафесар Навагродскі Т.А. працуе ў галіне папулярызацыі этналагічнай навукі, ведаў аб народнай кулінарыі сярод грамадскасці. Ім падрыхтавана серыя артыкулаў для Беларускай энцыклапедыі ў 18 тамах, энцыклапедыі «Гісторыя Беларусі» у 6 тамах, энцыклапедыі «Беларускі фальклор» у 2 тамах, «Энцыклапедыі беларускай кухні». Вучоны прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і публікацыі спецыяльных выданняў навукова-папулярнага профілю. Сярод апошніх «Вандроўка да хлеба» (2021) – сёмы выпуск серыі «Культурная спадчына Беларусі» на беларускай, рускай і англійскай мовах – своеасаблівы навігатар для хлебнага тура па Беларусі. Дадзенае выданне асвятляе гісторыю хлебапякарства на тэрыторыі Беларусі, прадстаўляе матэрыялы аб адпаведных павер'ях, звычаях, святах беларусаў, утрымлівае ўспаміны носьбітаў традыцыі, а таксама арыгінальныя рэцэпты [2].

На сённяшні дзень даследчык мае больш за 200 навуковых публікацый (сярод якіх – дзве манаграфіі, раздзелы ў калектыўных манаграфіях), большая частка якіх прысвечана традыцыям харчавання беларускага этнасу. У іх прадстаўлены фактычны матэрыял XIX – пачатку XXI стст., прааналізаваны састаўныя кампаненты традыцый харчавання (прадукты, стравы, спосабы прыгатавання, трапезы, прадметы хатняга начыння, правілы паводзін, звязаныя з прыгатаваннем і ўжываннем страў), раскрыта сувязь паміж імі, выяўлены асаблівасці традыцый харчавання розных саслоўяў на тэрыторыі Беларусі, ахарактарызавана сутнасць змен у традыцыях харчавання на працягу XX ст., раскрываецца сувязь традыцый харчавання з іншымі часткамі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага этнасу, паказана неабходнасць выкарыстання традыцый народнай кулінарыі ў сучасным харчаванні беларусаў.


1. Бачыла, І.Г. Традыцыі харчавання беларусаў у працах Т.А. Навагродскага / І. Г. Бачыла // Беларусь у XIX – XXI стст.: этнакультурнае і нацыянальна-дзяржаўнае развіццё: зборнік навуковых артыкулаў / Гом. дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны; рэдкал.: В.А. Міхедзька (адказны рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2015. – С. 266–271.
2. Вандроўка да хлеба / уклад. Л.Ф. Анцук. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2021. – 250 с.
3. Навагродскі, Т.А. Традыцыйная культура харчавання беларусаў: вуч. дапам. / Т.А. Навагродскі. – Мінск: БДУ, 2001. – 62 с.
4. Навагродскі, Т.А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст.: аўтарэф. дыс. … докт. гіст. навук: 07.00.07 / Т.А. Навагродскі; ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». – Мінск, 2015. – 50 с.
5. Навагродскі, Т.А. Беларуская народная кулінарыя XIX – пачатку XX ст. (Структурны аналіз): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.07 / Т.А. Навагродскі; ІМЭФ імя К. Крапівы. – Мінск,1995. – 18 с.
6. Навагродскі, Т.А. Народная кулінарыя як аб'ект навуковага даследавання / Т.А. Навагродскі // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 1994. – № 4. – С. 81.
7. Навагродскі, Т.А. Традыцыйная культура харчавання беларусаў / Т.А. Навагродскі. – Мінск: НІА, 2000. – 112 с.
8. Навагродскі, Т.А. Шлях даўжынёй у 20 год: кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ (2001–2021 гг.) / Т.А. Навагродскі // Этнокультурное наследие Беларуси в XXI веке: материалы междунар. научно-практ. конф., Минск, 18 июня 2021 г., / БГУ, истор. фак., каф. этнологии, музеологии и истории искусств; [редкол.: Т.А. Новогродский, И.В. Олюнина (отв. ред.) и др.]. − Минск: БГУ, 2021. – С. 3–7.
9. Навагродскі, Т.А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX стст. / Т.А. Навагродскі. – Мінск: БДУ, 2015. – 243 с.
10. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб.-метад. дапам. / Т.А. Навагродскі [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2009. – 335 с.